PolotskSU



УДК 392.1+392.5+615.89

# НАРОДНАМЕДЫЦЫНСКІЯ ЎЯЎЛЕННІ І ПРАКТЫКІ Ў ТРАДЫЦЫЙНАЙ РАДЗІННАЙ І ВЯСЕЛЬНАЙ АБРАДНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ

*В.І. МІШЫНА*
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт

*Разглядаецца спецыфіка прыёмаў і ўяўленняў, звязаных з народнай медыцынай, у кантэксце традыцыйнай радзіннай і вясельнай абраднасці беларусаў Падзвіння. Адзначана,найперш,прафілактычная скіраванасць народнамедыцынскіх уяўленняў і практык, што функцыянуюць у межах названых абрадавых комплексаў як абрадаў пераходу. На аснове зместава-сутнаснай агульнасці вылучаны групы рэгламентацый перадродавага этапу, накіраваных на паспяховы зыход цяжарнасці і прадухіленне фізічных і псіхічных адхіленняў у будучага дзіцяці. Прааналізаваны комплексы рытуальна-прафілактычных дзеянняў у межах пасляродавага этапу і абраднасці хрэсьбін. Ахарактарызаваны месца і роля канцэпту “здароўе” у сістэме каштоўнасных катэгорый вясельнай абраднасці (побач з такімі катэгорыямі як “доля” і “шчасце”). Разгледжаны лекавальныя функцыі асобных элементаў вясельнай атрыбутыкі (пярсцёнкаў, свечак, касцюма і яго дэталяў).*

Уводзіны. У межах традыцыйнай карціны свету здароўе чалавека, як адсутнасць псіхічных і фізічных адхіленняў у працы арганізма, разглядалася ў якасці нормы, што адпавядала ў цэлым уяўленням аб упарадкаванасці і гармоніі Макракосму [1, с. 174–175]. Адпаведна, парушэнне дадзенай нормы было скрайне непажаданым, бо, у канчатковым выніку стварала пагрозу не толькі існаванню чалавека, але і соцыуму, і Сусвету у цэлым. У сувязі з гэтым традыцыйнай свядомасцю выпрацаваны магутны комплекс народнамедыцынскіх уяўленняў і практык, скіраваны на прадухіленне і лекаванне хваробаў.

Асноўная частка.У склад названага комплексу ўлучаны і традыцыйныя сямейна-абрадавыя комплексы. Варта адзначыць, што традыцыйным абрадавым комплексам радзін і вяселля належыць адметная роля найперш у сістэме магічна-рытуальнай прафілактыкі разнастайных захворванняў і адхіленняў чалавека (то бок у дадзеным выпадку гаворка ідзе не пра факт наяўнай хваробы і неабходнасць яе лекавання, але пра захады па яе папярэджанні). Разглядаючы абрады пераходу як працэс змены не толькі соцыякультурнага, але і фізіялагічнага статусу чалавека, можна гаварыць, што, побач з іншымі характарыстыкамі, якія задаваліся для лімінальнага персанажа напачатку новага этапу яго жыцця, адной з важнейшых было менавіта забеспячэнне яго здароўем. У канчатковым выніку, ад стану здароўя залежыла магчымасць выканання чалавекам працоўных, рэпрадуктыўных і іншых важных для соцыуму функцый.

У кантэксце радзіннай абраднасці рытуальна-магічныя практыкі народнай медыцыны і прафілактыкі рэалізуюцца, найперш, у багацейшым комплексе рэгламентацый і прадпісанняў, што тычыліся цяжарнай жанчыны. Галоўнай функцыяй названых рэгламентацый было забеспячэнне, па-першае, паспяховага працякання саміх цяжарнасці і родаў,

PolotskSU



па-другое, прадухіленне разнастайных захворванняў дзіцяці, што мае нарадзіцца. Прычым большая іх частка грунтуецца на устойлівым усведамленні прычынна-выніковых сувязей паміж дзеяннямі цяжарнай жанчыны і наяўнасцю/адсутнасцю парушэнняў здароўя будучага дзіцяці: “Калі цяжарная падоўгу глядзіцца “у люйстру”, ці ў ваду, то дзіця будзе касавокім” [2, с. 3]; “Як маладая катоў б’ець нагамі, тады ў дзіцёнка каціная поўсьць” [3, с. 194]; “Цераз аглоблю не нада хадзіць – ногі будуць крывыя” [3, с. 194].

Пры досыць вялікай разнастайнасці павер’яў, прыкмет і правіл, звязаных з цяжарнасцю і родамі, можна вылучыць некалькі іх груп на аснове зместава-сутнаснай агульнасці рэгламентацый:

- *Пазбяганне локусаў, што маюць негатыўную семантычную афарбоўку*: “Цяжарнай патрэбна асцерагацца, каб а ні стаяць, а ні хадзіць па пілавіннях: дзіця будзе пакутваць на “разачку” [2, с. 4]; “Вельмі небяспечна цяжарнай спаць насупраць акна, калі праз яго могуць упасці промні месяца на яе і асабліва на аголены жывот: дзіця будзе хадзіць па месяцы” (лунацік)” [2, с. 7]; “Ужо як у палажэньні была бярэменная. …Нідзе месца не было, я хацела сесьці на камень. Вот. Ну і калі-небудзь сяду на камень. І іменна нельзя было, запрашчона. Бабкі казалі мне: “Няльзя садзіцца на камень!”. Вот, ну і вот дзевачка ў мяне радзілася і вы прадстаўце – цэлы год не было валасоў на галаве! Як на камені вот гладкае такое было” [3, с. 177].
- *Пазбяганне прадметаў, знешні выгляд і форма якіх звязваюцца з парушэннем намальнага ходу цяжарнасці і здароўя дзіцяці*: “Небяспечна наступаць на аглоблю, дугу, хамут, кнутавішча, абручы, абады, палазы і ўвогуле крывыя прадметы, нядбайна пакінутыя на двары: дзіця абавязкова стане гарбуном” [2, с. 4]; “Як толькі цяжарная пераступіць праз вяроўку, нітку, галлё, хмель, вязку ільну і канаплі, сноп ці прыгатванае для яго “вязьмо”, шыйка дзіцяці ў чэраве абмотваецца асабліваю плеўкай, якая прыблізна бывае падобна на адзін з пералічаных прадметаў, праз што ў дзіцяці “сцінаіцца дух”, а пры нараджэнні яно можа і “зыдусіцца” [2, с. 4–5]; “Не нада, вот прымерна, цераз вяроўкі іцьці, не нада цэп када вот навязана. Вот тада дзіця абязацельна раджаецца і пупавіна будзець закручана за самую шыйку і за ножку” [3, с. 231].
- *Пазбяганне асобных відаў камунікацыі з жывёламі:* “Вот бярэменная жэншчына: ніколі не нада біць ні ката, ні сабаку нагой. Тады ў дзяцёнка на плічах такія валасы паіўляюцца. Вот ён тады трэцца, вот як стануць яго ўжо спаць лажыць, а ён усё будзіць церцісі, крактаць і крактаць)[1]; “Скаціну падкідваць нагамі нельзя – цела у рабёнка будзіць касматае” [3, с. 51); “Калі ходзіць жанчына ў палажэніі ды ножкамі ці свінчо кідзель, ці ката, то ўжо шарсцінька гэта выганяюць” [4, с. 121].
- *Рэгламентацыя харчавання*: “Цяжарная павінна ўстрымлівацца ад ежы і піцця ўпоцемку: дзіця будзе пакутваць на “начніцы” [2, с. 6]; “Калі цяжарная любіць грызці і “смыктаць” косці, і пераважна, крылы птушак, то ў дзіця будзе хвароба “крылішчы” [2, с. 7]; “Няможна цяжарнай нічога ані есці, ані піць, седзячы на пасцелі, бо дзіця будзе мачыцца пад сябе” [4, с. 152].

[1]Запісана Мішынай В. І. і Мішыным П. І. у 2007 г. ад Ханяк А. І., 1932 г.н. у в. Макараўшчына Лепельскага р-на.

PolotskSU



- *Рэгламентацыя паводзін у стрэсавай сітуацыі*: “Калі глянеш на пажар і схопісься за ліцо, то застаюцца точна пальцы. Красныя. І яны ўжо радзімыя называюцца” [3, с. 106]; “Цяжарнай жонцы” нельга падоўгу глядзець на мерцвяца, і асабліва на яго твар, нават і ў тым выпадку, калі гэта будзе нехта з бацькоў, муж і дзіця, таму што нованароджаны будзе пакутваць на “бледную немач”. Ніхто не асудзіць цяжарнай, калі яна ўвогуле адстане ад пахавання” [2, с. 2–3]; “...Пажар. Ну і я туды на пажар прыляцела, ну і бабы на мяне кажуць: “Бабка, не бярыся нідзе рукамі”. А мне тут засвярбела, водзека. І я пацерабілася, і дзяўчына ж мая <...>, і пляма засталася пад нагой. А як за ліцо схвацюцца некатарыя, тады ліцо ўсё чырвонае, чырвонае, там страшна. Няможна”[2].

- *Абмежаванне камунікацыі з людзьмі, што маюць адхіленне ад нормы*: “Цяжарная не вельмі зазіраецца на кульгачных, сляпых, сухарукіх і ўвогуле калекаў, а таксама на карлікаў і веліканаў...: дзіця можа ўрадзіцца і на ўсё жыццё застацца з тымі недахопамі, якія ўразілі цяжарную маці” [2, с. 3]; “Каторы ідзець некрасівы – не глядзі на яго. Ці які нялюдскі. Не нада. Хай ідзець. Не трогай яго глазамі, а то тады рабёнак можа такі быць” [5, с. 294].

- *Рэгламентацыя працоўнай дзейнасці*: “Адзежу, як палошчыш адзежу… і ўжо як цяжарная жанчына, нельзя круціць па вадзе, нада ўжо падымаць уверх. Тады ўжо пры родах прыросшы будзіць, пупавінка прыросшы, акруціцца кругом галоўкі там, і пупавіна будзіць акручана”[3]; “Ну, ўсё гаварылі, што еслі цяжарная, у святы няможна, ну, сеч там штонебудзь…, а яна была такая жанчына, ну, вядома, маладая можа, ну і ня верыла. І яна кажыць, што: “Я тока адзін раз узяла тапор і палку перасекла, палажыла на парог, і дзевачка радзілася з аднэй рукой. І гаварылі, што за гэта ёй гэтак было”[4]; “Бярэменнай выкручваць бяллё нельзя было наводмаш, наатварот – абаўецца пупавіна каля горлышка. Ад сябе круціць трэба [5, с. 296]

- *Агульная рэгламентацыя камунікацыі і паводзін у соцыуме*: “Пажадана, каб цяжарная як можна часцей хадзіла ў царкву, але пры гэтым яна павінна станавіцца спераду, каб не маліцца ў патыліцы і спіны іншых багамольцаў – дзіця вечна будзе ў “паследышах” ”[2, с. 6]; “… губа расьсечана. Гэта з кім-та яна сварылася. Вот я гэтукую бабу знаю. Сварылася яна з сьвякроўкай. І яна ішла, а сьвякроўка ёй сьледам тапаром секанула па парогу. І ў сына стала расьсечаная губа” [3, с. 48]; “Няможна было хадзіць пазычаць. Я на сабе паспытала. Во гэты мы трысцен строілі (трэба было частаваць цесляроў) і я пайшла пазычаць яек. А яна (суседка): “Не, няма”. Я з хаты выходжу і чую… А ў іх хата без падлогі была, на гліне і яна схваціла камок гліны і за мной (кінула). І гэдак у мяне дзяўчынка радзілася, і так ужо гліну ела!” [3, с. 51]; “Вот бываець. Адна жыла ў Вухвішчах помню, і яшчэ дзеўкай была, там баба была ў палажэнні і завілася з аднэй бабай. Яна выхадзіла, а тая ўзяла, перасекла парог, яна адхадзіла, а та раз, раз парог. І радзіла з расечанай губою. Расьсекла губу. Радзіўся, як заяц, разьбітая губа” [3, с. 120].

- *Рэгламентацыі апатрапейнага характару*: “Прыступнічаючы на якой-небудзь гулянцы, і, пераважна на вяселлі, цяжарная павінна апранаць, па магчымасці, парны лік

[2]Запісана Мішынай В. І. і Мішыным П. І. у 2008 г. ад Рыбакоз В. І., 1925 г.н. у в. Нікіцёнкі Шаркаўшчынскага р-на.
[3]Запісана Захарэвіч А. Б. у 2010 г. ад Шыман Ф. Ю., 1926 г.н. у в. Доўгае Глыбоцкага р-на.
[4]Запісана Захарэвіч А. Б. у 2010 г. ад Шыман Ф. Ю., 1926 г.н. у в. Доўгае Глыбоцкага р-на.

PolotskSU



усялякай "адзежыны", напр., дзве кашулі дзве спадніцы, два паясы, дзве хусткі і інш. У процілеглым выпадку ў дзіцяці будзе недахоп у парных частках цела: у вачах, вушах вуснах, руках, нагах, пальцах і інш" [2, с. 6]; "- *І на пакойніка нельга глядзець?* - Ну, гавораць, на пакойніка есьлі, то абязацельна нада у красным платку ілі кофта штоб красная. - *А што можа быць?* Ну, бледны будзець. … Ну, нада ўжо, калі крайне ваабшчэ, не рэкамендавалася хадзіць ужо. А есьлі ўжо пойдзеш, ну бываець жа родственнік. Ну так нада, каб што-та краснае было" [3, с. 255].

У асобную групу можна вылучыць магічна-рытуальныя дзеянні, *скіраваныя на забеспячэнне лёгкіх і паспяховых родаў*, прычым яны могуць тычыца як патэнцыйнага дзетанараджэння ("Як толькі маладая засне ў першую шлюбную ноч, малады мусіць развязаць сваёй жонцы ўсе паясныя вузлы і расшпіліць каўнер кашулі – каб лягчэй было нараджаць дзяцей" [2, с. 66]), так і непасрэдна саміх родаў: "Каб дзіця хутчэй і вальней выйшла з мацярынскага лона, бабка спяшаецца развязаць усе вузлы адзення "радзішкі", расшпіліць каўнер яе кашулі і расплесці ёй валасы… Для гэтай жа мэты расплятаюць валасы і ўсе дзяўчаты, што знаходзяцца ў сям'і" [2, с. 9]; "Як раджаіць, тады мужык і каня рассупоніваіць, распрагаіць – каб і жонцы лягчэй радзіць было" [4, с. 192]. Відавочна, што падобныя дзеянні мелі на мэце садзейнічанне хутчэйшаму раскрыццю родавых шляхоў жанчыны. Адметна, што матыў раскрыцця, "адмыкання" фігуруе і ў замове, якую прамаўляла бабка-павітуха: "Я – са словамі, Бог – з помаччу табе, рабе Божай Алене роды адкрываці. Залатыя ключы, адамкніцеся, царскія вароты адчыніцеся" [6, с. 91].

Як вядома, комплекс маніпуляцый, што ажыццяўляліся бабкай-павітухай над нованароджаным, быў скіраваны на "фармаванне" неабходных фізічных (а таксама і маральных) якасцей [7, с. 41–44]. Немалое значэнне ў названым комплексе мела і група рытуальна-прафілактычных дзеянняў, што былі скіраваныя на забеспячэнне здароўя нованароджанага ў цэлым і папярэджанне рознага роду хваробаў: "Дзяўчынку трэба першы раз мыць у малаку, тады яна будзе белая, а хлопчыка ў піве, якое наліта ў "начоўкі і пыстаўляна на гарохвіны". Тады ён будзе моцны і прыгожы" [8, с. 5]; "Перад першым купаннем патрэбна ўліць дзіцяці ў рот крыху квасу ці "летняй" вады, каб дзіця не баялася ў будучым прастуды" [2, с. 11].

Увогуле пасляродавы перыяд для нованароджанага і парадзіхі быў адным з самых небяспечных, таму тут патрабавалася прымяненне разнастайных сродкаў засцярогі: "Роўна праз месяц пасля нараджэння кожнае дзіця перажывае "месячыну" – час асаблівай успрымальнасці да ўсіх дзіцячых хваробаў. Прадухіліць "месячыну" можа толькі тая жанчына, якая "бабіла" дзіця і якая, не зрабіўшы гэтага на першым купанні, павінна зрабіць праз тыдзень, але абавязкова ў дзень і гадзіну нараджэння дзіцяці. Звычайна бабка прасаджвае дзіця праз акно супраць "адслоненай" печы тры разы і тры разы заносіць яго ў хату з двара" [2, с. 37]; "Дзіця пакуль не пакрэсьціцца, нікому не паказвалі. Толькі бабка глядзела і мама карміла. … Пакуль не пакрэсьцяць, мальчыка звалі "младзеньчык", а дзевачку "дзевачкай" звалі. Даўней стараліся як мага хутчэй пеpaкрысьціць" [3, с. 104].

Рытуальная сацыялізацыя парадзіхі ў статусе маці і нованароджанага дзіця працягвалася ў час адведак і хрэсьбін. Актуальныя для гэтых этапаў магічна-рытуальныя

PolotskSU



дзеянні і перасцярогі былі, апроч іншага, скіраваныя і на папярэджанне магчымага шкоданоснага ўдзеяння, і на прадухіленне захворванняў.

Адведкі, па сутнасці, – гэта першая пасля родаў камунікацыя парадзіхі з прадстаўнікамі соцыуму (у дадзеным выпадку, жанчынамі-маці як прадстаўніцамі сваёй статуснай групы). Патэнцыйная небяспека дадзенага перыяду вымагала ўзмоцненых сродкаў перасцярогі як для парадзіхі, так і для дзіцяці: “Шматлікія “провідкі” не заўсёды праходзяць бясследна для дзіцёнка і парадзіхі і пакідаюць “нанос” – хваробу, вельмі падобную да ветраніцы. Для прадухілення “наносу”, з унутранага боку хаты кладуць ля парога нож ці іншую завостраную жалезную рэч – так, каб “провідка” абавязкова пераступіла цераз яе” [2, с. 41]; “Калі якую-небудзь сваячку ці суседку заспела месячнае ачышчэнне у дні “праведкаў”, яна наведвае парадзіху толькі пасля “кста”. Але і тут, каб не прынесці маці і дзіцяці “находу”, прыходзіць амаль цішком і з утыкнутай у падол кашулі іголкаю [2, с. 24].

Абрадавы комплекс хрэсьбін, як важнейшага этапу рытуальнай сацыялізацыі дзіцяці, таксама прадугледжвае прымяненне вялікай колькасці магічных прыёмаў засцерагальнага і прафілактычнага характару. Паездка кумоў з дзіцем да хросту – гэта, па сутнасці, першы выпадак, калі дзіця пакідае межы свайго локусу. Улічваючы незавершанасць лімінальнага перыяду, дарога да храма вымагае ужывання разнастайных апатрапейных прыёмаў і, разам з тым, дазваляе прадпрыняць адмысловыя дзеянні, накіраваныя на папярэджанне разнастайных хвароб і адхіленняў у будучым: “Паколькі, упершыню пакідаючы бацькоўскую хату, дзіця лёгка можа падвергнуцца “урокам”, то пасля купання бабка падкурвае малога свянцонымі зёлкамі (Іванаўскімі) і кладзе на падлогу, а маці тройчы пераступае цераз яго і перадае куме [2, с. 19]; “Калі “кумы” праязджаюць першыя ростанькі, то выкідваюць тут адмыслова ўзятыя гліну і соль, каб дзіця не пужалася “зазеху” [2, с. 20].

На этапе хрэсьбін асаблівую ролю ў рытуальнай сацыялізацыі дзіцяці ігралі кумы. Іх паводзіны падчас хрэсбін прадвызначалі многія аспекты будучага лёсу дзіцяці, у тым ліку і стан яго здароўя, і агульны характар развіцця. Таму дзеянні кумоў таксама падлягалі дастаткова строгай рэгламентацыі: *“А кумам што няможна рабіць, як дзіцёнка да хросту вязуць?* - Ну, як ехалі да касцёлу… Ты выязджаеш – не мачыся – памачыся дома. Каб у дарозе кумы не злязалі з калёсаў, а то рабёнак будзе мачыцца” [3, с. 51]; “Перад тым, як пераступіць парог… кума паднімае з падлогі “на хаду” саломінку, галінку, трэсачку, перакусвае папалам і праз галаву кідае абедзьве палавінкі назад у хату, каб дзіця хутчэй пачало хадзіць” [2, с. 20]; “Пры ўваходзе ў хату з ахрышчаным дзіцем кума павінна што-небудзь “лапатаць”, нават і ў тым выпадку, калі не маецца субяседніка. Добра будзе, калі ўслед за ёю гэта будзе рабіць і кум: тады дзіця хутка пачне гаварыць [2, с. 22].

У кантэксце традыцыйнага **вясельнага абраду** канцэпт здароўя ўлучаны ў сістэму каштоўнасных катэгорый, што фігуруюць у якасці даброт, якімі надзяляюць маладых на іх будучае сямейнае жыццё. Характэрна, што ў звязаных з надзелам узорах абрадавага фальклору “добрае здароўе” устойліва суседнічае з такімі катэгорыямі, як “шчасце” і “доля”. Пры гэтым у ролі падаўцы даброт выступаюць як непасрэдна бацькі маладых, так і міфалагічныя персанажы, якія, зыходзячы з вясельных тэкстаў, бяруць самы непасрэдны ўдзел у розных этапах абраду, а ў выпадку адсутнасці бацькоў, фактычна іх замяняюць: “Татулька

PolotskSU



мой родненькі // … Надзяляй мяне і долей, і шчасцем // І долей і шчасцем, і добрым здароўем” [9, с. 435]; “Сядзь-ка, Божа, на куту, // Баславі-ка сірату, // Баславі, божа, доленькай, / Шчасцем і добрым здароўем” [10, с. 80]. Здароўе, як адна з неабходных жыццёвых даброт, фігуруе і ў спецыяльных “надзельных” формулах, якімі благаслаўляюць маладых бацькі: “Ну, дятёнок, наделяю златым-серебром, добрым здаровьем” [11, с. 397]; а таксама у змесце рытуальнага прывітання ў момант, калі маладая прыязджае ў дом маладога: “Свякроўка пры сустрэчы пытае нявесту: “З чым жа ты ка мне, нявестачка, прышла?” Тая адказвае: “З хлебам і соллю, з добрым здароўем” [12, с. 28].

З вяселлем, як пачатковай “кропкай адліку” існавання маладых у новым статусе, звязана ўяўленне аб “завенчванні” хваробы: “Калі маладыя маюць якую-небудзь хваробу, апошняя “завенчваецца” на ўсё астатняе жыццё і, якой бы нязначнай не была хвароба, яна не вылечыцца потым” [2, с. 61]; “Нельга браць шлюб, калі ў аднаго з маладых ёсць хвароба, хоць бы яна была і вельмі нязначнай. Асоба, якая бярэ шлюб з хваробай, ніколі ад яе не вылечыцца і ўрэшце ад яе памрэ” [8, с. 99]. На нашу думку, падобную акцэнтуацыю стану здароўя маладых менавіта ў момант вянчання, варта суадносіць з больш шырокім комплексам прыкмет і павер’яў, з ім (вянчаннем) звязаных. Гэта, напрыклад, сустрэчы і падзеі па дарозе да вянца і назад, характар гарэння свечак у царкве, набор атрыбутаў, забароненых, або, наадварот, пажаданых у час царкоўнага шлюбу. Дастаткова вялікая колькасць рэгламентацый і прадпісанняў сведчаць, што само вянчанне ўваходзіць у лік важнейшых этапаў абрадавага пераходу, якія прадвызначаюць будучы лёс маладых [13, с. 239–241], адпаведна і стан іх здароўя ў гэты момант пэўным чынам “праграмуецца” на будучыню.

Вясельная атрыбутыка фігуруе і непасрэдна ў комплексе народнамедыцынскіх уяўленняў. У дадзеным выпадку яна выступае ўжо ў якасці лекавага сродку, які прымяняецца для палягчэння стану хворага альбо лячэння разнастайных хвароб. У якасці сродкаў народнай медыцыны найчасцей фігруюць такія рэчы, як:

- *вянчальныя свечкі*: “Вянчальныя свечкі запальваюцца потым толькі ў двух выпадках: а) пры цяжкіх родах; б) пры дзіцячым радзімцы, як толькі пачнецца прыпадак” [2, с. 61]; “Вянчальныя свечкі лічуцца вельмі карыснымі пры вылечванні ад ліхаманкі: імі падкурваюць хворых і тыя папраўляюцца” [14, с. 303];
- *вянчальны пярсцёнак*: “Півонія як цвіціць первы раз – харашо ад *худога.* У каго кальцо вінчальная ўзяць, праліць тры разы настой і напаіць” [4, с. 405];
- *вянчальная стужка*: “змяіны ўкус – каб спала пухліна, трэ абкручваць вянчальнай стужкай [3, с. 23]; “Ад укусу змяі адразу пасля яго моцна перавязваюць параненую частку цела вышэй, найлепш “вянчонай істужкай” (г.зн. стужкай са шлюбнага строю), каб стрымаць распаўсюджванне пухліны [4, с. 247];
- *вянчальнае адзенне:* “Кажуць, як балезнь чалавека дужа часта кідаіць, вянчальную адзежыну на яго, і ён тады быстра памрэць. І мама казала. Варажба гэта харошая. Як цяжолая гэта балезнь” [4, с. 389]; “Маці здымае з хворага дзіцяці кашульку, старанна вымярае яе суровай ніткай па ўсіх рубцах, пазначаючы меру вузламі, спавівае кашульку гэтай ніткай і замест падушкі кладзе “ў галовашкі”. На месца знятай кашулі яна адзявае дзіцяці

PolotskSU



другую, каўняром назад. Самае лепшае, калі яна надзене сваю вянчальную кашулю ці такую ж ад блізкай сваячкі, у якой няма пакуль дзяцей” [2, с. 43].

Відавочна, што ў дадзеным выпадку гаворка ідзе найперш пра прадметы, якія суправаджалі маладых падчас вянчання, г.зн. знаходзіліся ў царкве і тым самым набылі статус сакральных. У сувязі з гэтым, падаецца лагічным паставіць названыя атрыбуты ў адзін шэраг з іншымі рэчамі з падобным статусам: грамнічнымі свечкамі, свянцонай вадой, свянцонымі зёлкамі і да т.п, якія знайшлі шырокае прымяненне ў народнамедыцынскіх практыках.

Заключэнне. У кантэксце радзіннай абраднасці рытуальна-магічныя практыкі народнай медыцыны насілі перш за ўсё прафілактычны характар і былі накіраваныя на забеспячэнне паспяховага ходу цяжарнасці і родаў, а таксама на прадухілене магчымых захворванняў і адхіленняў у развіцці будучага дзіцяці.

У межах вясельнага абрадавага комплексу “здароўе” выступае як адна з каштоўнасных катэгорый і ўваходзіць у пералік дабротаў, неабходных для паўнавартаснага функцыянавання чалавека ў соцыуме. Акрамя таго, некаторыя вясельныя атрыбуты, звязаныя, найперш, з вянчаннем, у сілу набытага сакральнага статусу набываюць лекавальныя ўласцівасці і атрымліваюць прымяненне непасрэдна ў народнамедыцынскай рытуальна-магічнай практыцы.

ЛІТАРАТУРА

1. Валодзіна, Т. Цела чалавека: слова, міф, рытуал / Т. Валодзіна. – Мінск : Тэхналогія, 2009. – 431 с.
2. Никифоровский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах. Собраны в Витебской губернии / Н.Я. Никифоровский. – Витебск : 1897. – 336 с.
3. Полацкі этнаграфічны зборнік / склад. У.А. Лобач, У.С. Філіпенка. – Наваполацк : ПДУ, 2006. – Вып. 1. Народная медыцына беларусаў Падзвіння : у 2 ч. – Ч. 2. – 332 с.
4. Народная медыцына: рытуальна-магічная практыка / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі; уклад., прадм. і паказ. Т.В. Валодзінай ; навук.рэд. А.С. Ліс. – Мінск : Беларус. Навука, 2007. – 776 с.
5. Полацкі этнаграфічны зборнік / уклад., прадм. і паказ. У.А. Лобача.. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Вып. 2. Народная проза беларусаў Падзвіння : у 2 ч. – Ч. 2. – 368 с.
6. Радзіны. Абрад. Песні / уклад. і сістэм тэкстаў Г.А. Пяртроўскай, апісанне абрадаў Т.І. Кухаронак ; рэдкал.: А.С. Фядосік [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 1998. – 637 с.
7. Байбурин, А.К. Ритуал в традиционной культуре: Структурно-семантический анализ восточнославянских обрядов / А.К. Байбурин. – СПб. : Наука, 1993. – 240 с.
8. Шлюбскі, А. Матэрыялы для вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны : у 2 ч. / А. Шлюбскі. – Мінск : Інбелкульт, 1928. – Ч. 2. – 259 с.
9. Вяселле: Песні : у 6 кн. / рэд. А.С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980–1988 / склад. Л.А. Малаш; муз. дад. З.Я. Мажэйка. – 1985. – Кн. 4. – 733 с. – (Беларуская народная творчасць).

PolotskSU



10. Вяселле: Песні : у 6 кн. / рэд. А.С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980-1988 / ск лад. Л.А. Малаш; муз. дад. З.Я. Мажэйка. – 1983. – Кн. 3. – 768 с.
11. Народная традиционная культура Псковской области: Обзор экспедиционных материалов из научных фондов Фольклорно-этнографического центра : в 2 т. – Псков : Издательство Областного центра народного творчества, 2002. – Т. 2. – 816 с.
12. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края : в 3 т. / П.В. Шейн. – СПб : 1887-1902. – Т. 1, ч. 2. : Бытовая и семейная жизнь белорусса в обрядах и песнях. – 1890. – 708 с.
13. Мішына, В.І. Рытуальна-сімвалічныя функцыі могілак і царквы ў традыцыйнай вясельнай абраднасці беларусаў Падзвіння / В.І. Мішына. Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : зб. навук. арт II міжнар. навук. канф., Полацк, 17–18 красав. 2014 г: у 2 ч. / Полацкі дзярж. ун-т; пад агульн. рэд. Д. У. Дука, У. А. Лобача, С. А. Шыдлоўскага. – Наваполацк: ПДУ, 2014. – Ч.1. – С. 237-241.
14. Романов, Е.Р. Белорусский сборник : в 9 вып. / Е.Р. Романов. – 1886–1912. – Вып. 8 : Быт белорусса. – Вильна, 1912. – 600 с.

## PRESENTATION AND PRACTICE OF TRADITIONAL MEDICINE IN THE TRADITIONAL MATERNITY AND WEDDING RITUAL OF THE BELARUSIANS OF THE PADZVINNE

*V. MISHYNA*

*In the article the specific of receptions and representations related to folk medicine is examined, in the context of the traditional birth and wedding rituals of the Belarusians of the region Dvina. The prophylaxis orientation of people's medical concepts and practices functioning within the framework of the ritual complexes mentioned above has been noted. On the basis of content-essential communality, the groups of pre-natal stage regulation aimed at the benefit of the pregnancy and preventing physical and mental abnormalities in a future child are defined. Complexes of ritual-prophylactic actions within the postpartum phase and rituals of christenings are analyzed.The place and role of the concept of "health" in the system of value categories of wedding rituals (next to such categories as "share" and "happiness.") have been characterized. The medical functions of individual elements of wedding attributes (rings, candles, costume and its details) was investigated.*